Іосіф Зямчонак



ДАНІЛАВІЧЫ

1473 - 1998 г.г.

Гістарычны нарыс

ІОСІФ ЗЯМЧОНАК

Данілавічы

1473–1998

Гістарычны нарыс

ПАСТАВЫ
«СУМЕЖЖА»
2004

Кніга выдадзена ў рамках праекта захавання культурнай і гістарычнай спадчыны Паазер`я.

Распаўсюджваецца бясплатна на правах унутранай дакументацыі грамадскіх арганізацый, якія спрычыніліся дзеля яе выдання.

Аўтар выказвае шчырую падзяку
Выдавецкай Ініцыятыве „Сумежжа"
за падтрымку выдання

NED

L. SAPIEHA

Грамадскае аб'яднанне
«Фонд імя Л.Сапегі»

Пастаўская раённая
арганізацыя ТБМ
імя Ф.Скарыны.

East European Democratic Centre eedc

Кампутарны набор і вёрстка *Лілія Зямчонак*
Вокладка мастака *Сяргея Шчэрбы*
Фотаздымкі аўтара 1997-98 гг.
Адказны за выпуск *Міхал Гіль*

Нашы кантакты:
e-mail: michal.hil@tut.by, sumiezza@sumiezza.org
Internet: www.sumiezza.org

Да чытача

Для гісторыі мястэчак даўняй Віленшчыны „ураджайным" стаў 1998 год. Менавіта тады, амаль адначасова: у сакавіку, верасні і снежні адпаведна былі напісаны „Данілавічы 1473-1998. Гістарычны нарыс", „Лучай. Гісторыя маёнтка, мястэчка і вёскі. 1542-1998" і „Ваколіцы Парыжа. Старонкі гісторыі Пастаўскага Паазер'я". Яны сталі працягам задуманай мною яшчэ ў першай палове 90-ых гадоў XX ст. (тады настаўнікам і студэнтам) выдавецкай серыі « *Мястэчкі даўняй Віленшчыны»*, пачатак якой паклала „Мястэчка пры гасцінцы. Старонкі гісторыі Варапаева і бліжэйшых населеных пунктаў", Беларусь-Інфарм-Сэрвіс, Мінск 1995. *Данілавічы...* і *Лучай....* не дачакаліся ў той час выдання (прафінансаваць першы з тых нарысаў браўся мінскі і тамтэйшы прадпрымальнік, родам з Данілавіч, які раптоўна памёр) і былі пакладзены на паліцу, хоць і пабачылі свет у выглядзе фрагментарных публікацый у перыёдыцы і некалькіх экземпляраў камп'ютарных выдрукаў. Нават пачаў ужо падумваць, што рэанімацыя мікрагісторыі і адлюстраванне яе знешне сціплага мінулага ў друку не такая ужо і вартасная справа. Праз нейкі час натрапіў у кнігарні на працу Г. Рэнкоўскага *Сярод азёраў і балот Віленшчыны* (Варшава 2000), у якой спалучана цікавая формула турыстычнага даведніка з гістарычна-краязнаўчым апавяданнем пра мінуўшчыну даўняй Віленшчыны ў кантэксце бачання яе з берагоў *Белай Вады*, як называе Віслу славуты *Кодекс Альшэўскі Хамінскіх*, больш вядомы, як *Хроніка Быхаўца* і – злавіў сябе на думцы, што калі ў Польшчы ёсць гістарычная настальгія, то мне – „абарыгену" той зямлі грэхам будзе кінуць распачатую справу на паўдарозе.

Аб'яднаная тэматычна і геаграфічна „дылогія", прысвечаная колішнім мястэчкам-суседзям на старажытным Напалеонаўскім гасцінцу, званым некалі таксама Трактам Баторага (сёння паселішчы – у Віцебскай вобласці Беларусі), прапаную чытачам у тым выглядзе, як яны выйшлі з-пад кампутарнага пяра (а можа трэба казаць – курсора?) шэсць гадоў таму назад, унёсшы толькі невялікія папраўкі.

Варшава 2004.

Да 525-годдзя
першага прыгадвання
ў гістарычных крыніцах

Данілавічы

Сучасныя Дунілавічы першапачаткова мелі назву Данілавічы, Дунілаўскае. Да першага Усерасійскага перапісу насельніцтва 1897 года некаторыя геаграфічныя назвы не мелі цвёрда ўсталяваўшыхся правапісаў. У ходзе той кампаніі перавага была аддадзена „Дунілавічам".

Належаць да самых старых рэзідэнцый колішняга Вялікага княства Літоўскага. Упершыню ўпамінаюцца ў 1473 годзе як уладанне князя Аляксандра Юр'евіча Гальшанскага, атрыманае ім пры падзеле з братамі спадчыны бацькі – Юрыя Сямёнавіча. Тады Данілавічы насялялі сяляне-даннікі, якія плацілі даніну мёдам. Пасля смерці А. Ю. Гальшанскага ў 1511 годзе Данілавічы перайшлі да яго сына Паўла. У 1533 годзе ён завяшчаў свае ўладанні вялікаму князю, у 1551 годзе пацвердзіў гэта завяшчанне, якое было




Фота 1. Дунілавіцкі Траецкі касцёл




Ілюстрацыя 2. Траецкі касцёл


выканана пасля яго смерці ў 1555 годзе. Пад 1556 г. Данілавічы ўпамінаюцца як мястэчка; уваходзілі ў Ашмянскі павет Віленскага ваяводства. Вялікі князь ВКЛ Жыгімонт II Аўгуст падараваў іх Мікалаю Крыштофу Радзівілу, які валодаў Данілавічамі ў 1567-77 гг. Пазней перайшлі да Яна Дзмітрыевіча Долмат-Ісайкоўскага, уладальніка суседняга маёнтка Ваўкалаты. У 1624 годзе ён заснаваў у Данілавічах драўляны касцёл у гонар Св. Пятра і Паўла. Потым належалі яго сыну Каралю Пятру Долмат-Ісайкоўскаму. Пасля яго смерці ў 1640 годзе – дачцэ апошняга – Альжбеце, жонцы спачатку Крыштофа Рудаміны-Дусяцкага, потым Крыштофа Белазора. Апошні разам з супругай заснаваў у Данілавічах мураваны касцёл (1624 г.) і дамініканскі кляштар (1683 г.); на іх месцы ў 1769-73 гг. пабудаваны велічны Траецкі касцёл **(гл. фота 1 і іл. 2)**.



Ілюстрацыя 3. План Траецкага касцёла



Фота 4. Партал касцёла



Фота 5. Галоўны алтар



Фота 6. Правы бакавы алтар

Агромністы храм, размешчаны ў цэнтры вёскі, уяўляе сабой трохнефавую (неф = карабель, п р а д о л ь н а я ўнутраная прастора пабудовы, утвораная шэрагам калон) двухвежавую базіліку (прамавугольнае ў плане збудаванне, сярэдні неф якога вышэй бакавых і мае аконныя праёмы) з трансептам (папярочным нефам) і хорамі над прытворам. Апсіда (выступ будынка, які складае частку алтара) знаходзіцца ўнутры базілікі. Вежы трох'ярусныя, завершаныя купаламі з маленькімі дэкаратыўнымі галоўкамі і раскрапаваныя разам з фасаднай плоскасцю двайнымі ўвагнутымі пілястрамі (плоскімі вертыкальнымі цягамі). Астатнія сцены прарэзаны лучковымі праёмамі і раскрапаваны спаранымі прамавугольнымі пілястрамі. Па ўсім перыметры вонкавых сцен – шырокі карнізны пояс. Над ім ў цэнтральнай частцы галоўнага фасада (знешняй вертыкальнай сцяны) узвышаецца фігурны шчыт, які злучаецца з вежамі невялікімі валютамі: арнаментам у выглядзе завіткоў. Фасадныя плоскасці трансепта выгнуты, фланкіраваны шырокімі пілястрамі і завершаны фігурнымі франтонамі. Апсідная тарцовая плоскасць завершана


шчытом са складаным разарваным франтонам **(гл. іл. 3)**. Цэнтральны ўваход у касцёл акцэнтаваны парталам, які перабудаваны ў 1887 годзе ў формах класіцызму **(гл. фота 4)**.



Фота 7. Цудадзейны абраз Маці Божай Ларэтанскай

Скляпенні інтэр'ера цэнтральнага нефа цыліндрычныя, з распалубкамі на падпружных арках, у бакавых нефах – крыжовыя. Яны размаляваны раслінным арнаментам і картушамі – скульптурнымі ўпрыгожваннямі ў выглядзе шчытоў. Калоны і сцены раскрапаваны пілястрамі. Храм мае 5 алтароў **(гл. фф. 5, 6)**. Галоўны – двух'ярусны, ступеньчаты. Над ім знаходзіцца цудадзейны абраз Маці Божай Ларэтанскай **(гл. фота 7)**. Пад другім ярусам зроблены праход, які злучае сакрысціі. У нішы супрацьлеглай сцяны выраблена Труна Гасподня **(гл. фота 8)**. У 1998 годзе з фундацыі жыхара Польшчы С. Мядзёлкі ў храме ўстаноўлены арган **(гл. фота 9)**. Касцёл з'яўляецца прыкладам архітэктуры пераходнага перыяду ад барока да класіцызму.

Па дадзеных Здзіслава Сямашкі (былога данілаўскага парафіяніна) з Лондана першы прыходскі касцёл Нараджэння Дзевы Марыі заснаваны непадалёк ад рынку каля 1500 года. У 1624 г. Данілаўскую маёмасць набыў Ян Долмат-Ісайкоўскі. Ён забяспечыў парафіяльны касцёл некалькімі вёскамі, абавязаў святара




Фота 8. Труна Гасподня

ўтрымліваць „юнака для спеваў" і распарадзіўся „вучыць чалавечых дзяцей". Аднак пазнейшыя звесткі сведчылі аб тым, што школы не было. У 1683 годзе Альжбета Белазораўна ўзвяла на другім баку рынкавай плошчы драўляны касцёл Святой Троіцы і засяліла дамінікан. У 1773 годзе законнікі пабудавалі на гэтым месцы мураваны храм і манастыр (глядзі Z. S. Siemaszko „Niektóre parafie w dawnym Wielkim Księstwie Litewskim").

Гісторык А. Сапуноў сто гадоў таму падаваў, што „местечко Даниловичи расположено над озером Свидно и небольшой реке Пресмыч, в 1 версте от р. Голбеицы". Апошняя рака пачынаецца ў ваўкалацкіх балотах і ў сваім верхнім цячэнні называецца Заражанкай. Назва паходзіць, на думку Раісы Аўчыннікавай – старшыні секцыі тапанімікі Геаграфічнага таварыства, – ад слова „Ражанка" (рудая, іржавая вада, вільгаць). Яна (назва) перайшла на вёску, а потым ізноў на раку.


Данілавічы – былая вотчына князёў Гальшанскіх. У 1551 годзе пасля смерці Паўла Гальшанскага, біскупа віленскага, Данілавічы перайшлі па завяшчанню ва ўладанне польскага караля



Фота 9. Касцёльны арган

Жыгімонта Аўгуста. У 1558 годзе кароль „променял Дуниловичи, Лебедево и Хожовую" на маёнтак Курэнец з фальваркамі князю Мікалаю Радзівілу, ваяводзе віленскаму „съ подаваниемъ костёловъ и церквей русскихъ". У 1617 г. Альбрэхт Радзівіл прадаў Яну Ісайкоўскаму-Далмату „местечко Дуниловичи, волок оседлых 28, плацов и огородов 139, в том местечке костёл католический, ещё не имевший фундуша, и церковь русская". Затым мястэчка як пасаг Елізаветы Ісайкоўскай перайшло каля 1680 г. да Белазораў, ад апошніх – да Бжастоўскіх, потым да Янішэўскіх, пазней – да Тышкевічаў.

Гартаючы ў Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы г. Масквы фаліянты, у якіх вышукваў звесткі аб тутэйшых мясцовасцях, я натрапіў на кнігу, выдадзеную ў 1871 годзе ў Вільні: „ОРДИНАЦІЯ КОРОЛЕВСКИХЪ ПУЩЪ въ лъсничествахъ бывшаго Великаго княжества Литовскаго, составленная по инструкціи короля Владислава IV-го коммисарами Виленскимъ



Ілюстрацыя 10. Дунілавіцкі храм у 2-ой пал. XIX ст. (пасля 1864 г.)

каноникомъ и королевскимъ секретаремъ Петромъ Далматомъ Исайковскимъ и Упитскимъ маршалкомъ Бълозоромъ въ 1641-мъ году" (атрымоўваецца, што землякамі данілавічан).


„О церкви в Дуниловичах упоминается уже в нач. XVI в., а затем в 1617 г., 13 июня 1683 г. она владела 3 уволоками земель. Нынешний храм переделан из бывшего доминиканского костёла в 1864 г. [**гл. іл. 10**].

Костёл основан в 1624 г. Яном Дмитриевичем Долмат-Исайковским, переделан в 1690 г. Елизаветой Бяллозор, урождённой Исайковской, эта же Елизавета Бяллозор со своим мужем Кришстофом поселила здесь доминикан и построила для них каменный костёл и кляштар. Костёл после 1864 г. [у 1866 г.] переделан на

православную церковь...” (глядзі: А. Сапунов, В. Друцкий-Любецкий „Материалы по истории и географии Дисненского и Вилейского уездов Виленской губернии”, Витебск 1896 г.).

Альжбета Ісайкоўская перадала дамініканскаму касьцёлу абраз Св. Дзевы Ларэтанскай, прывезены ёй з Фларэнцыі Мікалаем Пацам, біскупам віленскім. Гэты абраз з сярэбранай аправай і такой жа каронай хутка праславіўся як цудадзейны. Пасля закрыцця ўрадавым дэкрэтам дамініканскага храма, абраз быў перанесены ў прыходскі касцёл, які згарэў да тла з усёй маёмасцю і алтарамі ад удара маланкі. Але прыхажанам удалося выратаваць абраз з полымя, што палічылася цудам.

Праз 20 гадоў пасля лістападаўскага 1830-31 гг. паўстання дамініканскі манастыр быў зліквідаваны. У 1920 гг. былы дамініканскі храм стаў парафіяльным. Пасля другой сусветнай вайны



Фота 11. Ксёндз Пётр Врубель

(у 1945 годзе) быў зачынены і вернуты каталікам вельмі пашкоджаным у канцы 80-х гадоў. З таго часу вядуцца рэстаўрацыйныя работы. Першая імша была адпраўлена 12 жніўня 1989 года святаром Кшыштафам Пажарскім, які пазней стаў каталіцкім святаром у Санкт-Пецярбургу. У дунілаўскай святыні на ніве адраджэння духоўнасці і касцёла шчыраваў ксёндз Пётр Врубель, а зараз Ян Пугачоў **(гл. фота 11)**. Шмат працы і сілы аддае парафіі таксама Дубовік Міхаіл – „залатых" рук майстар.

Па больш поўных звестках за 1617 год маёнтак Дунілавічы Ашмянскага павета складаўся: з мястэчка – 28 увалок, касцёла і царквы, вёсак Мышкі – 6,5 ув., Свірбно – 20 ув., Чорнае – 26,5 ув., Лашыца – 20 ув., Белева – 16 ув., Дараво – 25 ув., Гарадзішча – 15 ув., Лужкі – 8 ув. (Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў).

У 1793 годзе Данілавічы далучаны да Расійскай Імперыі, увайшлі ў Вілейскі павет Мінскай губерні, з 1843 г. – Віленскай губерні. У 1800 годзе мястэчка, уладанне Ігнацыя Янішэўскага, мела 101 двор, 564 жыхары. Янішэўскаму належалі 89 двароў (у т.л. 12 яўрэйскіх), 1 двор быў уласнасцю мясцовага дамініканскага кляштара, 6 – каталіцкага касцёла, 5 – уніяцкай царквы Св. Ігнація. Штогод праводзіліся 2 кірмашы: 1 кастрычніка і 6 студзеня. Пасля скасавання прыгону (1861 г.) – цэнтр воласці. Маёнтак Дунілавічы Дунілавіцкай воласці памешчыка Юлія Янішэўскага складаўся з сяла Пятровічы і мястэчка Дунілавічы, рэвізскіх душ (мужчынскага полу) – 211, у тым ліку: дваровых – 9, сялян-гаспадароў – 66, агароднікаў – 3, надзеленых зямлёй у ходзе рэформы – 27. Згодна з палажэннямі рэформы, сяляне павінны былі заплаціць памешчыку выкуп за зямлю. Яны ўносілі 20 % адпаведнай сумы, астатнія 80 % дзяржава пазычала з выплатай доўгу на працягу 49 гадоў. На маёнтку Дунілавічы выкупная пазыка склала 10704 руб. 16 кап., на пагашэнне якой на працягу гэтых гадоў належыла з усіх сялян штогод выкупных плацяжоў 642 руб. 25 кап.


Маёнтак Крыкалы Дунілавіцкай воласці Вілейскага павета: сяло Гліншчына, Мышкі і м. Лембаўка. Рэвізскіх душ – 129, у

тым ліку: батракоў – 12, дваровых – 10, сялян-гаспадароў – 26, надзеленых зямлёй – 9. Выкупная паэыка – 4160 руб. 30 кап., выкупныя плацяжы па 246 руб. 02 кап. у год.

У 1866 годзе ў Данілавічах **(гл. карту 1)** налічвалася 106 двароў, 691 жыхар, у канцы XIX ст. – каля 900 чалавек. У 1890 годзе згарэў парафіяльны касцёл, які царскія ўлады не дазволілі аднавіць на старым участку тэрыторыі з прычыны быццам бы блізкай адлегласці ад царквы. На тым месцы ў 20-30-х гг. XX ст. быў устаноўлены помнік у гонар польскай незалежнасці. Пасля 1939 года ён быў знішчаны, а цяпер тут знаходзіцца могільнік вайскоўцаў польскай арміі. Ксёндз-дэкан Аляксандр Дулько ўзвёў пасля таго пожара на сродкі Марыі Абрамовіч таксама драўляную святыню Св. Міхаіла на тэрыторыі маёнтка, належачага ўжо Тышкевічам. У 1910 годзе парафія налічвала 6528 вернікаў.

У другой палове XIX стагоддзя маёмасць плошчай 6390 дзесяцін, пераважна лесу, набыў граф герба Ляліва **(гл. іл. 12)** Юзаф Тышкевіч, а пасля яго атрымаў у спадчыну яго ўнук, таксама Юзаф (1895-1967 гг.), які валодаў Данілавічамі да 1939 года. Ён быў жанаты на графіні Марыі Патоцкай герба Пілява. Варшаўскі палац заможнай фамілііі Патоцкіх захаваўся да нашых дзён: знаходзіцца ў Кракаўскім Прадмесці (у ім размешчана Міністэрства Культуры) насупраць рэзідэнцыі прэзідэнта Польшчы..

У мясцовасці Крыкалы яшчэ ў другой палове XVIII ст. адзін з



Ілюстрацыя 12. Ляліва. Герб графаў Тышкевічаў




Фота 13. Палац Тышкевічаў у Крыкалах пасля рэканструкцыі ў 1914 г. Від з боку портыка

тагачасных уладальнікаў пабудаваў каменны аднапавярховы ў класічным стылі палац, які складаўся з 3-х частак: сярэдняй, 11-асявой, заснаванай на шырокім прамым вугле, а таксама двух значна больш вузкіх, адносна кароткіх бакавых крылаў. Сярэдняя частка мела высокі гонтавы ломаны дах, а крылы – гладкі двух-


схільны. Усе фасады двара былі падзелены здвоенымі пілястрамі дарычнымі з высокімі цокалямі. Яны вылучалі галоўную вось дома, два суседнія акны абодвух яе бакоў, а таксама пакрывалі вуглы суседняга корпуса і крылаў. Гэтыя пілястры былі адзінымі знешнімі элементамі дэкарацыі ўсёй пабудовы. Дом быў размешчаны ўпоперак узвышша на пагорку з крутымі схіламі, у выніку чаго яго сярэдняя частка прыняла адносна нізкую пасадку, а два бакі – высокія, да бачнасці падвалаў.

Невядома, як першапачаткова выглядаў уваход у двор, бо ў 1914 г. ён грунтоўна перабудаваны па праектах двух архітэктараў: Тадэвуша Растоўскага і Зімермана. З пачаткам першай сусветнай вайны рэстаўрацыйныя работы, якімі была ахоплена значная частка будынка, былі спынены. У 1914 годзе сярэднюю частку двара акцэнтаваў глыбокі портык **(гл. фота 13),** складзены з 2 часаных з пескаўца калон, узведзеных на квадратных базах. Яны паднімалі шырокі балкон, акружаны далікатнай чыгуннай балюстрадай. Вялізная плошча франтона была выканана з матывамі раслін, у якія былі ўплецены два шчыты герба, злучаныя графскай калонай. Адзін са шчытоў уяўляў фамільны герб Leliwe Тышкевічаў, другі – Pilawe Патоцкіх **(гл. іл. 14)**. Геральдычныя элементы на франтальным шчыце завяршала выява апярэння.



Ілюстрацыя 14. Pilawa. Герб Патоцкіх


У тым жа самым годзе пачалі абагачаць ніжнюю палаць даху. Змаглі зрабіць




Ілюстрацыя 15. Бакавое крыло сядзібы


толькі адно авальнае ўпрыгожванне з левага боку **(гл. іл. 15)**. Інтэр'ер будынка з традыцыйнай двухканцовай планіроўкай не меў каштоўнай мэблі і твораў мастацтва, бо апошнія гаспадары мала жылі ў ім.

З левага боку жылога будынка знаходзілася больш новае драўлянае двухпавярховае збудаванне, што служыла як летні домік **(гл. іл. 16, 17)**. Ён меў на вось паглыблены портык з дзвюма стройнымі калонамі. З фронтавага фасаду быў ашаляваны гарызантальнымі дошкамі. Дах чаўночны, гонтавы, не вельмі высокі. Ужо за межамі парка, паралельна адзін другому, узвышаліся яшчэ дзве другія гаспадарчыя пабудовы, узведзеныя ў той самы час, што і рэзідэнцыя гаспадара. Абодва мелі амаль ідэнтычныя фасады, падзеленыя чатырма масіўнымі пілястрамі, вызначаныя як галоўныя. Іх завяршалі мансарды з паўкруглымі аконнымі адтулінамі і гладкія сцены, атынкаваныя па баках. Усярэдзіну вялі шырокія і высокія дзверы.




Ілюстрацыі 16 і 17. Летні домік у Крыкалах





Фота 18. Былыя гаспадарчыя пабудовы сядзібы ў Крыкалах

У гады першай сусветнай вайны двор быў спалены, а пасля яго не адбудавалі. Захаваўся перароблены дачны домік, дзве гаспадарчыя пабудовы з цагляными тарцовымі фасадамі ў формах позняга класіцызму **(гл. фф. 18, 19)**, а таксама парк, размешчаны на левым беразе ракі Галбяіцы, праз 1,5-2 км на паўночны захад



Фота 19. Былыя гаспадарчыя пабудовы сядзібы ў Крыкалах

ад Дунілавіч. Каля тэрыторыі парка плошчай 15 га праходзіць старая шасэйная дарога Дунілавічы–Варапаева, што з'яўляецца яго паўднёва-заходняй граніцай. На ўсходняй ускраіне знаходзіўся пададзены вышэй сядзібны дом. Уваход у яго ўпрыгожвалі скульптуры львоў. Непадалёк быў фантан, шмат



Фота 20. Дрэва-волат у былым парку Тышкевічаў

кветак. Парк вырашаны ў пейзажным стылі. Разбіты на схілах 7 узгоркаў, якія падзелены глыбокім ярам. Кампазіцыя грунтуецца на эфекце паслядоўнай змены шэрагу маляўнічых курцін (участкаў зямлі, засаджаных адной пародай дрэў) і ландшафтных перспектыў. Каларыстычная гама паркавых курцін пабудавана на спалучэнні клёну, ясеню, вяза, ліпы, вольхі, лістоўніцы. Векавых асінволатаў, якія цяпер упэўнена валяць на дровы, яшчэ шмат засталося ўздоўж дарогі Крыкалы–Дунілавічы **(гл. фота 20)**. Дамінуючым элементам у сілуэце паркавага масіву з'яўляюцца экземпляры старога ясеню, высаджанага на паўднёва-ўсходняй ускраіне парка, ля берагоў ракі. Выязная кляновая алея, натуральна выгінаючыся па рэльефу, пачынаецца круглай тэрасай, абсаджанай па перыметру клёнамі. Непадалёк размешчаны два невялікія штучныя вадаёмы.

Архітэктура ўцалелых сядзібных будынкаў і пейзажны характар паркавых кампазіцый адлюстроўваюць рамантычны напрамак у дойлідстве і садова-паркавым мастацтве Беларусі канца XVIII-XIX ст.

Вялізны жывапісны парк, моцна праэджаны ў 1914-20 гг. пасля спалення рэзідэнцыі, не даглядаўся. У ім знаходзіцца чортаў камень **(гл. фота 21)**, з якім звязана некалькі легенд.

Сама гэтая мясцовасць уражвае нейкай таямніча-рамантычнай затоенасцю сярэднявечча, якое ўжо, лічылася, існуе толькі ў раманах Ул. Караткевіча. Здаецца: яшчэ хвіліна – і паміж магутных векавых дрэў убачыш танюткія постаці паненак-прыгажунь, якія некалі тут жылі, або самога гаспадара фальварка – старога графа. А мо, нават і легендарную вупражку, кіруемую самім чортам, што імчыць праз незвычайнай прыгажосці вісячы плецены мост, названы Чортавым, на шабаш з графам-чараўніком. Апошні мог зрабіць так, што ніводнай змеі не было на сямі ўзгорках, дзе знаходзіцца парк, у той час як навокал страшна было ступіць, так іх было шмат. І зусім халадзее ўнутры, калі, прабраўшыся праз гушчар, падыходзім да Чортавага каменя ля Лысай гары, дзе быццам бы адбываўся той шабаш. Валун будзе



Фота 21. Чортаў камень

ў рост чалавека і нагадвае па будове сэрца. З аднаго боку ён плоскі і, па легендзе, меў нейкія таямнічыя знакі: не то выяву якой карты, не то што іншае, сцёртае няўмольным часам.

Але ўвесь рамантычны настрой раптам знікае, калі нечакана перад сабой бачыш перакапаныя фамільныя могілкі гаспадароў сядзібы з параскіданымі помнікамі XVIII-XIX ст.ст. Прыгадваецца і лёс паненак, зажыва згарэлых у сваім доме, падпаленым работнікамі фальварка ў запале барацьбы з „эксплуататарамі". Так пераплятаюцца паміж сабой легенда і рэчаіснасць.

Сядзібна-паркавы комплекс графаў Тышкевічаў ў Крыкалах разам з Траецкім касцёлам уключаны ў праект Залатога кола Беларусі.

З мястэчка Данілавічы паходзіць Любоў Ісакаўна Аксельрод (літаратурны псеўданім Артадокс), філосаф і літаратуразнаўца. Нарадзілася ў 1870 годзе. Скончыла Бернскі універсітэт у 1900 г. У рэвалюцыйным руху з 1884 г. З 1887 г. у эміграцыі, працавала ў групе „Вызваленне працы". Паслядоўніца Г. В. Пляханава. У 1900 г. уступіла ў „Саюз рускіх сацыял-дэмакратаў за мяжой". Супрацоўнічала ў часопісе „Заря" (1901-02 гг.), газеце „Искра" (1901-05 гг.). Вяла перапіску з У. І. Леніным. Пасля II з'езда РСДРП (1903 г.) ад бальшавікоў адышла. У газеце „Северо-Западный край" апублікавала артыкул „Аб праблемах ідэалізму" (1905 г.), дзе выступіла супраць філасофіі рэвізіянізму. З 1906 года ў Расіі, выдала зборнік „Філасофскія нарысы" (1906 г.), друкавала артыкулы ў часопісах „Наша заря", „Современный мир", „Дело" і інш. Абараняла марксісцкую філасофію ад нападак прадстаўнікоў эмпірыякрытыцызму, аднак сама рабіла ўступкі агнастыцызму і рэлятывізму (падае „Советский Энциклопедический Словарь"). У 1915 г. выслана з Петраграда. У 1917 г. член ЦК партыі меншавікоў, пляханаўскай групы „Адзінства". У 1918 г. ад палітычнай дзейнасці адышла. З 1921 г. у Маскве, выкладала філасофію ў інстытуце чырвонай прафесуры, Дзяржаўнай акадэміі мастацкіх навук, распрацоўвала пытанні філасофіі і мастацтва.

Па дадзеных за 1905 год, у Дунілавічах Вілейскага павета налічвалася:

маёнтак (гр. Тышкевіча) – 74 жыхары;

мястэчка, р. Заражанка – 1400;

касцельная сядзіба – 10.

Мелася Камера Судовага Следчага (падобная ўстанова ў Вілейскім павеце была толькі ў г. Вілейцы і м. Радашковічы), урачэбны ўчастак (з 1892 года працаваў прыёмны пакой на 2 ложкі). Тут, у мястэчку, знаходзіўся старэйшы ўраднік, валасное і мяшчанскае кіраванне, лаўка № 143.

Сельскія таварыствы воласці: Дунілавіцкае, Ясеневіцкае, Зарэжскае, Крыкальскае, Надазернае, Пахоўскае. У маёнтку Крыкалы графіні Любянецкай – 40 жыхароў. Усяго населеных месцаў у воласці было 64, з іх: 13 фальваркаў, маёнткаў, сядзіб, 20 – засценкаў, 4 – выселкі, астатнія – вёскі, сёлы, старажоўкі і інш.

У 1911 годзе ў Дунілавіцкім храме (на той час царкве) знаходзілася копія цудадзейнага абраза Маці Божай „Достойно Есть – Милующая", якая была напісана і падаравана інакамі рускага манастыра храму ў г. Глыбокім. Вось як аб гэтым пісалі „Церковные ведомости" (правапіс захаваны): „Внутри иконы сокровенно вложены и навсегда заделаны частицы св. мощей многих угодников Божиих и кусочки ватки, освящённой на Гробе Господнем, на св. мощах и пред многими чудотворными иконами Божией Матери, пропитанной св. елеем из неугосимых лампад на Гробе Господнем, на Голгофе, на Гробе Бога Матери, окроплена св. водой из реки Иордана и из других живоносных источников и иная многая благодатная Святыня из Иерусалима и с Афона внутри ея сокровенно заделана...

Икона была получена в м. Дуниловичах 6 июня 1911 г. священником Дуниловичской церкви о. Иоанном Левицким. С подобающей Святыни честью, была внесена в Дуниловичский храм, где и хранилась до дня перенесения. С разрешения и благословения Высокопреосвященнейшего Агафангела, Архиепископа Литовского и Виленского 12 июня она торжественно пере-

несена через Ласицкий и Верхнянский приходы в м. Глыбокое на расстоянии до 35 вёрст. Накануне перенесения св. иконы 11 июня (в субботу) в Дуниловичском храме было совершено всеночное бдение с чтением акафиста Божией Матери, а 12 июня в 7 часов утра – литургия, после которой, по приглашению духовенства, народ, бывший в храме, охотно принял участие в крестном ходе и Образ Божией Матери, установленный на специально устроенные носилки, украшенные зеленью и цветами, был на плечах несом девицами из богомольцев до ближайшей по пути Ласицкой церкви (10 вёрст). Крестный ход сопровождали священники Дуниловичской церкви Иоанн Левицкий и Глубокской Евфимий Диволовский с хором Дуниловичской церкви, исполнявшего во время пути священные песнопения. На всём пути предстояло пройти два селения: Ласицу и Верхнее. В половине 12-го крестный ход приблизился к Ласицкой церкви. На встречу св. Иконы вышел настоятель церкви о. Иоанн Кадлубовский с огромным по количеству богомольцев крестным ходом. Произошла трогательная картина встречи двух крестных ходов и Образа Божией Матери. Свящ. о. Иоанн Кадлубовский при встрече Святыни произнёс прочувствованное слово. На его приветствие священник о. Иоанн Левицкий тоже ответил прекрасным поучением; народ от умиления плакал. Со Святыней вошли в храм, где коленопреклонённо пропели все богомольцы: „Под Твою милость прибегаем...” и все стали прикладываться к иконе, что продолжалось до 2 часов. В 2 часа дня крестный ход тронулся в путь. Торжественно при пении 1000-й толпы обнесён был Образ Божией Матери вокруг Норицкого храма. Подъём духа был необычайный. Весь народ двинулся провожать Святыню. Громко разносилось в воздухе тысячеголосая песнь: „Пресвятая Богородице, спаси нас”. На всём пути встречалось много арок и триумфальных ворот, сооружённых ревнителями торжества православия и украшенных зеленью, цветами, полотенцами и увешанных образами и зажжёнными свечами. При этих арках народ, стоя на коленях с зажжёнными свечами в руках, встречал Свя-

тыню. Каждый раз священники, сопровождавшие крестный ход, произносили соответствующие событию поучения. Целые толпы богомольцев по пути присоединялись к крестному ходу, который час от часу увеличивался. В половине 5-го он приблизился к с. Верхнему. Священник Верхнянской церкви о. Иоанн Зиневич вышел навстречу Святыни с громадным крестным ходом. Произошла обычная встреча крестных ходов. Прочувствованное слово о. И. Зиневича при встрече Святыни вызвало у народа слёзы умиления и духовный восторг. Образ был внесён на короткое время в храм и потом снова вынесен и поставлен на крыльцо храма, так как огромное количество Богомольцев ни в коем случае не могло бы вместиться в маленькой Верхнянской церкви. Поклонение Образу продолжалось более 2 часов. В 7 часов вечера крестный ход двинулся в путь к м. Глубокому. Образ был торжественно обнесён вокруг Верхнянской церкви; при выходе из церковного погоста свящ. Е. Диволовский произнес прочувствованное слово, призывая Богомольцев объединиться и сопровождать Святыню до крестного хода, идущего для встречи Образа из м. Глубокого. В начале 9 часов показался величественный крестный ход, идущий на встречу из м. Глубокого. Было почти 10 часов вечера, когда грандиозный крестный ход приблизился к храму, на пороге которого Святыню встретили член Государственной Думы священник о. Александр Вераскин с настоятельницей Березвечского женского монастыря игуменией Сергией и почётнейшими сёстрами обители. Был совершён вокруг храма крестный ход и Образ торжественно внесён иереями в украшенный зеленью и ярко освещённый свечами храм и поставлен посреди его на возвышенном месте, после чего был совершён акафист Божией Матери, прочитана коленопреклонённая молитва... Небывалое и неслыханное здешней местности торжество было истинно великим и светлым праздником...

По случаю этого события всем духовенствам и народу, участвующим в духовном торжестве, был послан Его Высокопреосвя-

щенству Агафангелу Архиепископу Литовскому и Виленскому почётный рапорт...

Почётный рапорт был Высокопреосвященнейшим Архиепископом Агафангелом представлен Императору, который написал на нём:

«Прочёл с удовольствием. Николай»".

* * *

У Расійскім Дзяржаўным Гістарычным Архіве захаваліся два дакументы (месцамі выразна тэндэнцыйныя), якія датычацца рамантавання Дунілавіцкага храма. Яны дапамагаюць узнавіць той час пачатку XX стагоддзя:

„*Его*
Высокопревосходительству
Господину Министру Финансов

В. П. И.
Дуниловичское
православное
Свято-Никольское братство
Января 21 дня 1915 г.
№ 522
м. Дуниловичи
Виленской губернии, Вилейского уезда.

В Вилейском уезде Виленской губернии в м. Дуниловичи стоит огромных размеров православный приходский храм, коему уже 220 лет. Приход Дуниловичский беден и не может содержать сего храма. Ежегодно, как свидетельствует запись в клировых церковных ведомостях, причту и Братству нужно изыскивать до 300 руб. на стороне на содержание и частичные ремонты храма. Всегда попрошайничать и надоедать добрым людям очень обременительно. Тем труднее это при нынешнем капитальном ремонте сего храма. После произведённого ремонта на частные пожертвования добрых людей на сумму свыше 4700 руб. оказался новый непредвиденный раньше начисленных по смете Архи-

тектора, утверждённой строительным отделом Виленского Губернского Правления от 26-го июня с./г. за № 248, в 1251 руб. 2 коп. Так как Синод ныне все свободные строительные средства направил на построение Сибирских церквей, то на все ходатайства Литовского Епархиального Начальства об ассигновании средств на содержание и ремонты церквей Литовской Епархии, в том числе и Дуниловичской, отвечал решительным отказом. О сем причту Дуниловичской церкви дано знать Указом Литовской Духовной Консистории от 26 июля с./г. за № 7758. Между тем в Дуниловичской церкви грибком разрушается алтарный пол и кирпичный фундамент храма. Последнее обстоятельство серьёзно грозит зданию разрушением. Вообще такой величественный храм, как Дуниловичский, находящийся в торговом центре иноверного населения без поддержки в благолепном виде, вызывает насмешки иноверцев, что служит не малым соблазном для угнетаемых католиками православных. А на такое поддержание храма в приличном виде нужны постоянные средства.

Вот почему Дуниловичское Св. Никольское братство считает своим священным долгом почтительнейше просить Ваше Высокопревосходительство, не признано ли будет возможным в сем году ассигновать на окончание ремонта Дуниловичской церкви 1251 руб. 2 коп. согласно вышеозначенной смете и на постоянное поддержание храма 5000 руб.; а всего 6251 руб. 2 коп.

Председатель Братства, Помещик Влад.
[прозвішча неразборліва] подпись
Товарищ Председателя, Священник Иоанн Левицкий подпись
Члены Совета: И. д. Судебного Следователя
Учитель Дуниловичской ц.-пр. школы
О. Свентицкая подпись
Антон Рудницкий
Ю. Пусько
Делопроизводитель, Псаломщик подпись".

„Его
Превосходительству,
Господину
Товарищу Обер-Прокурора
Святейшего Синода
П. С. Даманскому.

Ведомство
Православного
исповедания
Архиепископ
Литовский и Виленский
Сентября 12 дня 1913 г.
№ 8692

Ваше превосходительство, Милостивый Государь Пётр Степанович.

Вследствие отношения, от 4 апреля за № 12912, с возвращением прошения Председателя Дуниловичского Свято-Никольского Братства об оказании пособия на ремонт Дуниловичской церкви и на постоянное поддержание храма, имею честь сообщить, что, как видно из дел подведомой мне Консистории, Братства Дуниловичской церкви неоднократно обращалась с прошениями о назначении денежного пособия на ремонт и содержание названной церкви; так: 1) в 1909 году помянутое Братство обращалось в Святейший Синод с прошением о назначении постоянного пособия на содержание означенной церкви, но указом Святейшего Синода от 20 июня 1911 года за № 8220 прошение это было оставлено без удовлетворения в виду крайней ограниченности средств Святейшего Синода. 2) Указом Святейшего Синода от 19 ноября 1911 года, по ходатайству бывшего члена Государственной Думы священника Верапсина о назначении постоянного пособия на содержание Дуниловичской церкви, отпущено было единовременно 200 руб.; каковые и высланы были причту Дуниловичской церкви. 3) В 1912 году в апреле месяце причт Дуниловичской церкви, донося Консистории о произве-

дённом ремонте в Дуниловичской церкви и её ограде на сумму 4042 руб. 67 коп., собранную от благотворителей, просил Епархиальное Начальство об отпуске 1342 руб., недостающих на окончание ремонта церкви. Но просьба эта оставлена без удовлетворения за неимением в распоряжении Епархиального Начальства средств.

Что же касается состояния и положения Дуниловичской церкви в настоящее время, то местный благочинный, спрошенный по предмету прошения Дуниловичского Братства, препровождённому Вашим Превосходительством донёс рапортом от 14 мая сего года, что Дуниловичская церковь по своим громадным размерам постоянно требует значительных затрат для своего поддержания и ремонта. Приход малочислен – 1841 душа обоего пола, прихожане очень бедны и положительно невозможно на местные средства содержать в соответствующем виде храм. 9 мая он, благочинный, лично осматривал храм, и оказалось, что в алтарной части деревянный пол совершенно изъеден грибком настолько, что необходимо немедля сделать новый; на сей предмет казною уже отпущено 150 деревьев, но денег нет и вся надежда на пособие от казны. Вследствие изложенного, просьбу Дуниловичского Братства благочинный находит вполне справедливой и заслуживающей удовлетворения.

Ввиду прописанного донесения благочинного, имею честь сообщить Вашему Превосходительству, что Литовское Епархиальное Начальство со своей стороны просьбу Дуниловичского Братства о назначении денежного пособия на окончание ремонта церкви, так и на постоянное её поддержание признаёт вполне заслуживающей удовлетворения.

Призывая на Вас Божие Благословение, с совершенным почтением и преданностью имею честь быть

Вашего Превосходительства покорнейший слуга Архиепископ Агафангел".

Большая частка царкоўна-будаўнічых крэдытаў 1914-1915 гг. згодна з законам 27 ліпеня 1914 года была звернута на ваенныя патрэбы. Астатняя іх частка была размеркавана паміж найбольш нястачнымі царквамі, і звароты наконт Дунілавіцкага храма былі пакінуты без увагі.

У час першай сусветнай вайны 29 верасня 1915 года ў м. Дунілавічы ўвайшлі часці германскай кавалерыі, якія рассеялі і часткова захапілі абозы 8-ай рускай кав. дывізіі. Даведаўшыся аб гэтым, камандзір 1-га коннага корпуса асабіста прыскакаў у штаб 8 дывізіі ў в.Лучай і аддаў загад начальніку гэтай дывізіі генералу Кісялёву: „Сабраць дывізію і праз Лісіцы наступаць на Дунілавічы з захаду". Адначасова камандзіру 14-ай кавалерыйскай дывізіі было загадана наступаць з поўначы на мястэчка на фронце Алешына–Ясеневічы.

Генерал Кісялёў асабіста на рысях накіраваўся з дывізіяй на Лісіцы, адтуль павярнуў на Ажуны, далей на Мышкі і Чорнае ў абход Дунілавіч з поўначы і тым самым даў магчымасць германскай конніцы адступіць у заходнім накірунку на злучэнне са сваімі часцямі. Пакуль 8 кав.дывізія прасоўвалася на Чорнае ў 10 км ад Дунілавіч, немцы пакінулі паселішча і забралі з сабою частку захопленых раней абозаў.

Аўтар часопіса ваенных дзеянняў так тлумачыў гэтае здарэнне: „Не прыбыццё дывізіі Беласельскага і адыход з прызначанага накірунку 8 кавалерыйскай дывізіі, зайшоўшая, магчыма выпадкова, конніца праціўніка пайшла беспакарана". Пошукі германскай кавалерыі працягваліся да позняй ночы, а некаторымі часцямі – да раніцы наступнага дня. Пасля чаго вайскоўцы размясціліся ў ваколіцах Дунілавіч: 14 дывізія ў раёне Анкуд, 8 – Пятровіч, штаб 1-га коннага – у Сароках.

Камандзір 1-га коннага корпуса сцвярджаў, што ў мястэчка прарвалася цэлая кавалерыйская брыгада. Сапраўды, можна дапусціць, што які-небудзь германскі эскадрон мог быць. Што датычыцца цэлай брыгады, ды яшчэ з захопленымі абозамі, то такое злучэнне не магло хутка з'явіцца і знікнуць бясследна. Не

падлягаюць сумненню наступныя факты. У Дунілавічах мела месца паніка. Начальнік 8 кав. дывізіі генерал Кісялёў з дывізіяй заблудзіў. Нарэшце перпы корпус у поўным складзе прыняў удзел у пошуках бясследна знікшай кавалерыі. Як бы тое ні было, але гэтымі падзеямі пачалася дзейнасць маладой коннай арміі генерала Араноўскага, якому дырэктыва Імператара Мікалая II прадпісвала аб'яднаць пад сваім кіраўніцтвам 1-ы корпус, зводны корпус генерала Туманава, конны атрад генерала Казнакова, 3-ю Данскую казацкую дывізію і атрад генерала Патапава. Задачай было адкінуць дзейнічаючыя супраць яе сілы немцаў, прарваць іх размяшчэнне на Свянцяны, Падброддзе, для далейшых дзеянняў або ў тыл Дзвінскай групы праціўніка або больш глыбокае ўтварэнне на Панівеж, Вількамір. Пасля далучэння яшчэ двух конных карпусоў, 1-й коннай гвардзейскай, 5-й, 6-й, 13-й, 14-й кав. дывізіяй і Усурыйскай коннай брыгады армія Араноўскага налічвала 41 конны полк у складзе 246 эскадронаў і соцень з 17 коннымі батарэямі ў колькасці 117 гармат.

Вясной 1916 года Імператар Мікалай II праводзіў у Дунілавічах, якія знаходзіліся тады за 25 км ад лініі фронту, агляд сваіх войскаў.

Пасля 1917 года ў гэтай мясцовасці былі спачатку бальшавікі, потым немцы, потым з канца 1918 года ізноў бальшавікі. З вясны 1919 г. – палякі, з лета 1920 – ізноў бальшавікі, і, нарэшце, з восені 1920 – палякі.

24 чэрвеня 1919 г. загадам Міністэрства унутраных спраў Польшчы ўтвораны павятовыя камэнды дзяржаўнай паліцыі. Ажыццяўлялі кантроль за дзейнасцю паліцэйскіх пастэрункаў (участкаў), вялі барацьбу з крымінальнымі злачынствамі і рэвалюцыйным рухам.

„Зусім сакрэтна
Паліцэйскай камэндзе ў Дунілавічах
і начальніку раёна.
Згодна распараджэння ... правесці дазнанне і ўстанавіць:

1) у якіх мясцовасцях бальшавікамі былі ўстаноўлены „рэвкомы";

2) персанальны склад такавых;

3) месца пражывання асобных членаў рэўкома;

4) іх дзейнасць перад інвазіяй і ў цяперашні час.

Каб не выклікаць падазронасці, расследванне праводзіць як мага асцярожней і без грунтоўных падстаў нікога не арыштоўваць.

12.11.1921 г., № 441

Стараста Дунілавіцкі. Подпіс".

За „польскім" часам **(гл. карту 2)** у м. Дунілавічы працаваў лесапільны і цагельны завод, лесаэксплуатацыя, млын, кузня, піларама. Была наладжана вытворчасць дываноў, пашыў жаночага адзення, шапак, выраб скур, дзейнічаў ткацкі цэх, фарбавальня, гадзіннікавая майстэрня. Мелася вышэйшая яўрэйская і агульнаадукацыйная школы, касцёл, 3 сінагогі, кнігарня, пераплётная, банкі, доктарская, аптэкі, ламбард, гасцініца, выраб завівак. Практыкавалі адвакат, натарыус, судовы выканаўца, дантыст, ветэрынар. Быў рэстаран, кулінарыя, чарачная, піўная, кааператыўны гандаль конямі, спажывецкімі і рознымі таварамі; абутковая, швачная. Працавалі землямеры, шаўцы, сталяры, бляхары, слесары, муляры.

У 1921-22 гг., да ўтварэння Віленскага ваяводства, існаваў Дунілавіцкі павет (пазней Пастаўскі). У мястэчку налічвалася шмат вуліц, сярод якіх – Віленская (цяпер Савецкая), Варапаеўская (Савецкая з дома № 13), Крыкальская (М. Горкага), Пахоўскага (Альцоўская), Ясеневіцкая (пэўны час называлася вул. 9-ці байцоў, цяпер Асяненкі). Пра тых байцоў мясцовыя жыхары расказваюць анекдатычны выпадак, які адбыўся ў 1940 годзе. Ехала, быццам, машына з рускімі вайскоўцамі і каля касцёла раптам пачала страляць выхлапнымі газамі. Салдатам выдаўся абстрэл. Пачалася мітусня, сапраўдная стралянiна, і 9 чалавек былі забіты і паранены.

У Дунілавіцкую гміну ўваходзілі наступныя вёскі: Каліты, Міхалін, Пятровічы, Сяргеевічы; засценкі – Свідна і Зарэжжа **(гл. фрагмент карты 3)**.

У Свідне меўся цагельны завод, належаў Тадэвушу Шкорніку, у Міхаліне – млын. У Зарэжжы – вятрак, а таксама працавалі каваль і кравец. Каваль яшчэ быў у Калітах і Пятровічах. У апошняй вёсцы і кравец. Сталяр – толькі ў Сяргеевічах.

Буйнейшымі зямельнымі ўласнікамі з'яўляліся: граф Тышкевіч Юзаф (1064 дзес.), Цыбульскі Адам (Гараватка 109), Яцына Баніфацый (Пахоўшчызна 66), Янішэўскі Віктар (Старыя Ясеневічы 264), Карэцкі Павел (Міхалін 825), Казлоўскі Адам (Зарэжжа 63), Макавецкая Марыя (Новыя Ясеневічы 187), Аскерка Яніна (Крыкалы 512), Рамбальскі Антон (Ляўкова 55), Сівіцкі Ян (Гараватка 108), Снарскі Людвік (Парневічы 87), Стаб-



Фота 22. Сельскагаспадарчая выстава ў Данілавічах. Ксеракопія з часопіса „Przysposobienie Rolnicze" за 1934 г.

роўскі Нікадзім (Зарэжжа 63), Турло Адэлія (Зарэжжа 62), Турло Рамуальд (Зарэжжа 63), Варанкевіч Антон (Сарокі 358), Варанкевіч Ян (Лісуны 357), Зямчонак Браніслаў (Гараватка 110).

У часопісе „Przysposobienie Rolnicze" за 1934 год быў надрукаваны фотаздымак з сельскагаспадарчай выставы ў Данілавічах (**гл. фота 22**).

Гісторыяй, якая адбылася ў мястэчку Дунілавічы ў 30-х гг. XX ст., не пагрэбаваў бы і Шэкспір для сюжэту адной з сваіх трагедый. Аднак Шэкспіра сярод местачкоўцаў не аказалася. Таму трагедыю ніхто не напісаў. Але з'явілася песня.

ДУНІЛАВІЦКАЯ БАЛАДА

У аўторак уранні,
Як сонейка ўзышло,
Прыйшоў Мар'ян к Аліне,
Сказаў ён ёй ўсё.
– Аліна дарагая,
Ці знаеш, што зрабіў:
Сягоння на світанні,
Матулю я забіў.
Я знаю, дарагая,
Што мне цяпер рабіць.–
З таго ж пісталета
Хачу цябе забіць...
– Навошта нам страляцца,
Калі ахвота жыць?
Але:
Мар'ян не думаў доўга
І пісталет бярэ.
І проста без прыцэлу
Аліне ў грудзі б'е...
– А дзе гэты злачынец,
Што донечку забіў,
Гадочкі маладыя

Ў труну яе злажыў?
Вязлі хаваць Аліну
У чорнай у труне,
Мар'ян тады хаваўся
Між ветак на сасне.
Матулю толькі раніў,
Над мілаю грудок...
І на яе магіле
Націснуў на курок.

„...Над Дунілавічамі бушавала вясна. Быў канец красавіка. На могілках, як і ўсюды навокал, шумелі-калыхаліся ледзь кранутыя лістотай дрэвы. Тут сабраліся людзі з усяго павета. Хавалі дзяўчыну. Прыгожую, маладую. Яна ляжала ў труне ў бялюткім вясельным убранні. Яе забойца сядзеў на вялізнай сасне, што расла непадалёк, і глядзеў зверху на тую, якую кахаў так моцна, што здолеў забіць... Назаўтра ён прыйшоў на свежую магілу, прыставіў пісталет да скроні і націснуў на курок...

...Вялізны шэры помнік. На ім барэльеф Божай маці ў жалобе. Літары за 60 гадоў амаль не сцёрліся, таму надпіс на помніку можна прачытаць: „Аліна Самовіч. Жыла 26 гадоў. Забіта 28 красавіка 1936 года". Кім? І гэта было напісана на помніку, але нечая клапатлівая рука здзёрла-саскрэбла польскія літары, каб праз гады ніхто не зразумеў і не ўспомніў...", – падавала аб гэтым выпадку Алена Ляўковіч.

З 1939 года Дунілавічы ў складзе БССР. 15.01.1940 года набылі статус гарадскога пасёлка, сталі цэнтрам Дунілавіцкага раёна. З 04.07.1941 г. па 04.07.1944 г. былі акупіраваны фашысцкімі захопнікамі. За тры гады нямецкай улады ў раёне загінулі 992 чалавекі, з якіх 828 (у тым ліку 300 дзяцей) – у Дунілавіцкім гета ў лістападзе 1942 года. Гітлераўцы ўчынілі расправу над яўрэйскім насельніцтвам. Тое, што адбывалася тут паслужыла ці не сюжэтам для аповесці Васіля Быкава „Жоўты пясочак", бо амаль



Фота 23. Помнік на месцы Дунілавіцкага гета

тысяча людзей не здзейсніла нават спробы неяк выратавацца, а пакорліва прынялі смерць. Трупы расстраляных і параненых вывозілі за 1 км ад мястэчка і закопвалі ў вялікай загадзя падрыхтаванай яме. На месцы злачынства памяць загінуўшых ушаноўвае абеліск **(гл. фота 23)**. Праліўныя дажджы нават у 1998 г. навымывалі тут чалавечыя астанкі.

У ліпені 1943 года Дунілавічы былі моцна пашкоджаны ў ходзе вайсковай аперацыі Арміі Краёвай на пост нямецкай паліцыі. Гэта была адна з першых акцый АК у Віленскай акрузе.

Дунілавічы і раён вызвалены воінамі 92-га стралковага корпуса, (камандуючы генерал-маёр М.Б. Ібянскі) 43-й арміі 1-га Прыбалтыйскага фронту ў ходзе Полацкай аперацыі, а таксама – партызанамі брыгады імя Ракасоўскага.

Працытую адзін дакумент таго часу на мове арыгіналу, з захаваннем асаблівасцяў правапісу:

„Отношения райкома партии и Райисполкома: После общего собрания Дуниловичского городского совета и между гражданами города: Постановили:

1. Организовать в Дуниловичах сапоженую и портняжскую мастерскую, в виду того, что населения совсем розувшись и ремонт производить нету где.

2. Отстроить байню, в виду того, что в городе Дуниловичи нету где, служащему и рабочему, после работы произвести себе порядок и культурный вид.

3. Создать кузнечно-слесарный цех при Дуниловичах, ввиду того, что в населения не имеется где подковать лошадей, и другие виды ремонта, сельскохозяйственного инвентаря и прочие работы!

4. После оккупации немцами данной территории по прибытию Советской власти, граждане города Дуниловичи, предлагают о снятии секретаря гор/совета, в виду того, что данная секретарша до сегодняшнего дня, была правой рукой немецкой власти, брат секретаря гор/совета служит в полиции и в данный момент уехал с немцами. Секретарь гор/совета Маевская работала в пользу немцев; раскатываясь в карете; населения спрашивает, мы не можем понять хто-же может работать или же честный крестьянин Советского Союза, или бывшая немецкая сотрудница; Дуниловичский гор/совет предлагает, секретаря с работы снять и поставить на должность партизанку, которая одолела [верагодна, мелася на ўвазе „отдала"] всю свою антиотыву [мабыць, „инициативу"] Советской Власти Т. Ходан, Ходан Таню Ивановну!

Просим наше решение гор/совета Дуниловичи утвердить.
5/XII.1944 г. Пред. гор/совета! Леония".

З сакрэтнай дакладной запіскі сакратара Дунілавіцкага РК КП(б)Б Якаўлева сакратару Полацкага АК КП(б)Б Жэляніну „О наличии бандитских проявлений по Дуниловичскому району с 1.7 по 12.7.45 года".

„Докладываю Вам, что бандитский террор усиливается и бандитские группы принимают активные действия по отношению к активным работникам, работникам села, уполномоченным

деревень, финансовым работникам, агентам уполнаркомзага, предам с/с, а также – терроризируют их семьи, ограбляют их имущество, так же грабят имущество райпотребкооперации. Грабят ларки, избивают заведующих прилавками, убивают лучших возчиков леспромхоза, которые перевыполняют нормы по лесовывозке.

...2. В ночь со 2 на 3 июля бандгруппа в количестве 6 человек, вооружённая автоматами, убила жителя д. Балаи Тузбицкого с/с, активного рабочего леспромхоза, который выполнил план лесовывозок за июль месяц на 180 % Станюша Егора Антоновича, 1902 года рождения.

3. 4 июля 1945 года в 24 часа в д. Петровичи Дуниловичского с/с на хутор гражданина Гинько Эдмунда Петровича ворвалась банда, в это время у его ночевал работник Поставского отделения спецсвязи Берлюков Николай Фёдорович 1910 года рождения, отняли у него автомат и пистолет и увели его с собой, о судьбе его неизвестно, по всей вероятности, где-то убили.

4. 8 июля в 4 часа дня во время служебного собрания по агитации рабочей силы для Глубокого и мобилизации крестьян на лесовывозку в деревнях Сергеевичского с/с возле д. Токи был убит председатель Сергеевичского с/с т. Свентинский Николай Фёдорович и ранен в руку был из групы содействия Парневич Болеслав Викентьевич".

Не адна сотня жыхароў Дунілавіцкага раёна беспадстаўна падвяргалася гвалту з боку савецкай улады ў часе барацьбы з заможным сялянствам і палітычнага пераследу іншадумцаў. Спісы неабгрунтавана рэпрэсіраваных і раскулачаных змешчаны ў маёй кнізе „Мястэчка пры гасцінцы. Старонкі гісторыі Варапаева і бліжэйшых населеных пунктаў" (Мінск 1995 г.). Прывяду толькі адзін прыклад. Справа Літвіновіча Якава Мікалаевіча, якую вёў народны суд Пастаўскага раёна.

З пратакола допыту 16 сакавіка 1950 года. „Літвіновіч Якаў, нарадзіўся ў вёсцы Параскі Савіцкага сельсавета Пастаўскага

раёна Маладзечанскай вобласці, беспартыйны, адукаваны, жанаты, па нацыянальнасці – беларус, па сацыяльнаму паходжанню – кулак, жыхар вёскі Крыкалы Дунілавіцкага раёна Полацкай вобласці, са слоў – раней не судзімы, грамадзянін СССР.

Я нарадзіўся ў 1885 годзе, дзе пражываў да 1920 года, займаўся сельскай гаспадаркай. У 1910 годзе я выехаў у Амерыку, дзе працаваў у горадзе Бердзіфордзе на фабрыцы, якая выпускала тканіны. У 1921 годзе я вярнуўся на радзіму ў вёску Параскі. У 1923 годзе купіў 30 га зямлі ў вёсцы Чэтверць Пастаўскага раёна".

Купіў на сваю бяду. І ці ж ён адзін быў такі? Але пазнаёмімся з пратаколам допыту гэтага „злачынцы" далей: „...пры былой Польшчы я меў 6 кароў, 3 коней, у час пасяўной і ўборкі наймаў да 10 чалавек работнікаў, меў пастуха. У 1940 г. у маёй гаспадарцы зрабілі абрэзку зямлі да 15 га. У 1941-45 гадах меў 4 каровы, 2 коней (і гэта пры акупацыі!).

У 1948 годзе прызнаны кулаком. Мне налічылі сельгаспадатку на суму 13 600 рублёў. Я выплаціў звыш 5000 рублёў, больш не змог. У канцы лістапада 1948 года я вырашыў схавацца. Выехаў разам з жонкай у Полацкую вобласць, Дунілавіцкі раён, вёску Крыкалы, дзе жыў у знаёмага Ю. Матошка да затрымання органамі МДБ у 1950 годзе".

Суд вызначыў Літвіновічу Я. М. 7 гадоў з канфіскацыяй маёмасці і паражэннем у правах на 3 гады. Адсядзеў Якаў праўда толькі 2 гады і, быў вызвалены:

„Вярхоўны Суд БССР. 8 лютага 1952 г. № 421 Начальніку турмы № 3 г. Баранавічы.

Накіроўваецца копія вызначэння Вярхоўнага Суда БССР на Літвіновіча Я. М., асуджанага нарсудом Пастаўскага раёна Маладзечанскай вобласці для неадкладнага вызвалення з-пад варты. Аб выкананні тэрмінова паведаміць Вярхоўнаму суду БССР са спасылкай на нумар і дату вызвалення".

Падпісаў гэту радасную для селяніна паперу намеснік старшыні Вярхоўнага Суда БССР Абушкевіч. Вялікімі літарамі па-

значана „ТЭРМІНОВАЕ ВЫЗВАЛЕННЕ". Савецкая ўлада абрабавала сям'ю Літвіновіча, зрабіла яе злачыннай, а потым хоць змілосцівілася. Цярпелі сотні і тысячы такіх хлебаробаў па ўсёй Беларусі.

Гартаючы ў Глыбоцкім архіве падшыўку газеты „Сцяг Сталіна" за 1955 год, я натрапіў на сатырычную рубрыку „Наш кракадзіл". Пэўным штрыхом да характарыстыкі часу прадстае фельетон „*Тихо вокруг...*":

„Если дело идёт об абонентной плате, то работники Дуниловичского радиоузла „не спят в шапку". Возьмут, и даже досрочно, с каждого обладателя радиоточкой. А вот, чтобы наладить нормальную работу радиоузла вовсе не заботятся. Уже второй месяц жители д. Дуниловичи не слушают радиопередач из Москвы, Минска.

Надсмотрщик радиоузла Егор Иванов и его сотрудники додумались применить кое-что „новое" в вещании. Ремонтируя линию Воропаево–Дуниловичи, они продали часть столбов окрестным жителям за горелку. И в нетрезвом виде, сидя на столбах, напевали: „Тихо вокруг...". Наверное, не знают они, что слушателям надоела такая музыка.

По разрешению начальника райконторы связи тов. Терентьева, я установил и зарегистрировал радиоточку. Но Егору Ивановичу чего-то не понравилось. Пьяный он зашёл ко мне в квартиру, оторвал радиопроводку, в присутствии публики обозвал мою жену, медсестру Дуниловичской больницы, нецензурными словами и удалился в спокойном расположении духа.

Интересно, кто позволил Иванову творить такие безобразия? Когда же жители д. Дуниловичи будут слушать радио?

Пора бы начальнику райконторы связи пресечь самодурство распоясавшихся горе-работников Дуниловичского радиоузла.


Л. Кухальский, д. Дуниловичи".

З 08.06.1950 г. Дунілавічы – цэнтр сельсавета, з 16.07.1954 г. – вёска ў Дунілавіцкім, з 20.01.1960 г. у Глыбоцкім, з 25.12.1962 г. у Пастаўскім раёнах. У 1971 годзе налічвалася 246 двароў, 781 жыхар. Цэнтр калгаса „XXV партз'езд". Цяпер у Дунілавічах працуе сярэдняя школа, дом культуры, дзіцячы сад, паліклініка, бальніца, аптэка, ветпункт, аддзяленне сувязі, некалькі магазінаў, прыватнае прадпрыемства „Заазёрнае".


На тэрыторыі сельсавета маецца базавая школа і ФАК у Сяргеевічах, дом-інтэрнат для інвалідаў. У Пятровічах знаходзіцца рэтранслятар **(гл. фота 24)**. Пабудаваны ў 1975 годзе. Вышыня 56 метраў. Зона прамой бачнасці 40 км. З'яўляецца таксама арыенцірам пры палётах верталётаў.

На 01.01.1998 года ў Дунілавічах **(гл. фота 25)** пражывала 769 чалавек; у сельсавеце – 1590 чалавек і 203 у доме-інтэрнаце.

У Дунілавіцкай СШ **(гл. фота 26)**, якая мае вельмі станоўчы імідж сярод навучэнцаў, бацькоў і настаўнікаў, дзейнічае турысцкі клуб „Надзея". Яго ўдзельнікі здзяйсняюць не толькі трэніровачныя, адна-, двух- і трохдзённыя паходы, але і катэгарыйныя. У прыватнасці, у часе паходаў II катэгорыі складанасці, вучні пабывалі на Каўказе, у Крыму, Карпатах,



Фота 24. Рэтранслятар у Пятровічах




Фота 25. Мікрараён новабудоўляў

Кольскім паўвостраве, Камчатцы, Курылах. Вандроўкі занатаваны на фота-, слайд- і відэафільмы **(гл. фота 27)**. Турысцка-краязнаўчай работай у школе кіруе В. А. Бульбяноў, яе дырэктар, настаўнік фізікі, заўзяты аматар рамантыкі падарожжаў. Ён мае II разрад па турызму, з'яўляецца інструктарам пешаходнага турызму. Больш 10 гадоў члены яго аб'яднання былі ўдзельнікамі збораў і спаборніцтваў у Маскве. У 1989 г. кіраўнік клуба ўдзельнічаў ва Усесаюзнай навукова-практычнай канферэнцыі па турысцка-краязнаўчай рабоце. Дунілавіцкая СШ экспанавалася на ВДНГ СССР. В. А. Бульбянову ўручана адпаведнае пасведчанне.

У пачатку 70-х гг. у школе выкладала Марыя Антонаўна Вайцяшонак, пісьменніца. Яе сям'я, як асадніцкая, была выслана з вёскі Грыдзькі Пастаўскага раёна ў горад Змяінагорск, дзе яна нарадзілася 03.05.42 г.

Друкуецца з 1959 года. У 1972 г. скончыла філалагічны факультэт БДУ. З 1974 г. на журналісцкай працы ў „Сельскай га-



Фота 26. Дунілавіцкая сярэдняя школа

зеце", часопісах „Нёман", „Беларусь", штотыднёвіку „Літаратура і мастацтва". Аўтар кніг нарысаў „Сярод блізкіх людзей" (1988 г.). „Жанчына каля люстэрка" (93 г.). У іх пісьменніца адлюстравала сённяшнюю вёску, дзе, на яе думку, захаваны вытокі духоўнасці, чалавечай мудрасці і дабрыні.

Выступае таксама з апавяданнямі і казкамі. Член Сюза Пісьменнікаў СССР з 1990 г.



Фота 27. Удзельнікі клуба „Надзея" Дунілавіцкай СШ у часе вандроўкі ў г. Беластоку. 1995 г.

На 769 жыхароў Дунілавіч прыпадае 7 некропаляў і помнік 34 землякам, загінуўшым у гады другой сусветнай вайны. Сярод „гарадоў памерлых" – стары яўрэйскі могільнік, другі – вайскоўцаў польскай арміі з 36-га палка Legii Akademickiej, пад камандаваннем палкоўніка Ульрыха, пазней міністра, потым лонданскага эмігранта, загінуўшых у ваколіцах Дунілавічах у 1920 годзе ў баях з арміяй Тухачэўскага, якую складалі гулагаўцы.

На ўсходнім сонечным ускрайку вясковага могільніка („на пяску" – як кажуць тутэйшыя) знаходзіцца пахаванне і адметны помнік (**гл. фота 28**), устаноўлены ў 30-х гадах XX ст., супругам Сямашкам са шляхты герба Лебедзь: Себасцьяну і Канстанцыі з Якавіцкіх, былым уладальнікам з 1618 года маёнтка Ляхаўшчызна. Іх продак Ян, баярын панцырны, якога падае Нясецкі (T. IV, с. 80), быў сярод 1142 чалавек, падпісаўшых Кейданскі трактат 1655 г. з Каролем Густавам, што падцвярждаецца ў „Athenaeum Wileńskie" (1935 г., T. 10, с. 209). Выступіўшы такім чынам на баку князя Януша Радзівіла – вялікага гетмана (начальніка войска) літоўскага і



Фота 28. Помнік Сямашкам: шляхце герба Лебедзь

Густавам, што падцвярждаецца ў „Athenaeum Wileńskie" (1935 г., Т. 10, с. 209). Выступіўшы такім чынам на баку князя Януша Радзівіла – вялікага гетмана (начальніка войска) літоўскага і ваяводы (намесніка вялікага князя) віленскага, меўшага намер аддзяліць ВКЛ ад Польшчы, скасаваць Люблінскую вунію і ўтварыць федэрацыю Літоўска-Беларускай дзяржавы са шведскім каралеўствам.

Мужны волат Ян Сямашка паслужыў Генрыку Сянкевічу да вобраза рыцара Лангіпівуса Падбіпенты ў рамане „Агнём і мячом". Эпітафію на магіле Яна Сямашкі падае Ул. Караткевіч у рамане „Нельга забыць".

Нашчадак Сямашкаў Збігнеў Себасцьян 1923 года нараджэння, сын апошняга ляхаўскага землеўласніка, пражыўшы савецкі ГУЛАГ, трапіў у Велікабрытанію. Скончыў факультэт электронікі Лонданскага універсітэта. Спецыялізаваўся ў галіне кантроля абсталявання, выкарыстоўваемага ў ваеннай сферы. Жыве ў Лондане. Акрамя прафесійных інтарэсаў займаецца гісторыяй.

У 1992 годзе ў лонданскім выданні „Dziennik Polski" надрукаваў ураджанні аб наведванні радзімы, дзе ён піша: „В этом году я навестил после 52 лет свой родной край, между Поставами и Глубоким на Виленщизне, которые теперь принадлежат Беларуси. Вот письмо настоятеля костёла моей парафии в Дуниловичах, ксендза Кшиштофа Пожарского, который там работает около 2 лет.

„В жизни прихода Дуниловичи и Лучай, которым я служу, многое изменилось к лучшему после того, как почти год вместе со мной работает законная сестра из Польши, Серафитка, т. к. больше времени можно посвятить детям и молодёжи.

В июле и августе прошлого года около 100 детей были на своём первом причастии. Подготовка шла 2 месяца, 4 раза в неделю по 3 часа. Много из этих детей приехала из глубины России. Живут здесь их бабушки и дети приезжают к ним во время каникул.

В конце сентября и начале октября были Святые Миссии проводимые о.Редемптористами. 7 дней в Лучае и 7 дней в Ду-

и молодёжи, день больных, освящение машин, мотоциклов, велосипедов. Людей было очень много, а новостью было то, что почти каждый день я ездил с отцами миссионерами в большие деревни для того, чтобы в доме культуры или в деревенском клубе могла быть Св. Месса и миссийная проповедь. Таких выездов было 20. Были мы также в Ляховщине, где в доме культуры собралось около 200 человек.

28.X. проходил визит ксендза арцибискупа Казимера Свёнтка. В Лучае в то время был отпуст почитания Св. Тадеуша. К таинству миропомазания приступило 150 человек. Зато в Дуниловичах вместе с ксендзом - арцибискупом молились вместе по ружанцу.

С октября началась, благодаря сестре законной Горетти, нормальная учёба религии детей и молодёжи. Что правда, много ещё трудностей, но почти 300 детей пользуются этой возможностью. Учим детей в 5 пунктах. В Дуниловичах (в доме ксендза), в Волках, Новосёлках, Старом Дворе (в домах частных), а также в Ляховщине (в доме культуре).

Ещё месяц тому назад учили мы детей в 2-х школах, так было в течение почти 5 месяцев, но последнее время нас оттуда выгнали (главные областные власти Витебска). Шла достаточно острая борьба на тему обучения религии в школе, но когда директорам школ угрожали, то и я отступил.

Учил также около 100 детей польскому языку в основном после урока религии.

Во время Рождества приготовили сценку. Показали её в 6 местах. Теперь во время Большого Поста будет Мистерия. В ней приняло участие около 40 детей и молодёжи. Сценка на Рождество была на белорусском, зато Мистерия будет на белорусском, но песни на польском. Имеем запись на видео, а также запись визита ксендза арцибискупа Свёнтка, но теперь эти кассеты в Польше.

Так кратко мог я написать о духовной жизни прихода в течение последнего полугода. Кроме этого проводится обыкновенная

работа с прихожанами. Недавно закончил я колядовать. Ходил в течение 2 месяцев. Был почти в 70 больших и малых деревнях. Был также в Ляховщине. Теперь живёт в ней 48 католических семей, или 120 католиков.

В последние месяцы возрастает также конфликт с районными властями (в Поставах), также и с областными. Они обеспокоены моей такой широкой деятельностью. Хотели, чтобы ксёндз сидел только в костёле, а такая деятельность их удивляет, но я не могу работать по-другому, если только всего отдавать себя.

Относительно ремонтных дел в костёле Дунилович, то в прошлом году было сделано красивое огрождение вместе с брамой (стоимость 70 тыс. руб.), на стенах повесили новую большую „Крестную дорогу" (гипсовую за 20 тыс. руб.), закончились работы, связанные с отоплением костёла (25 тыс. руб.). К празднику Всех Святых должен уже быть орган, финансирует его пан Мядёлко из Болеславца (давний дуниловичский прихожанин).

Хочу вместе с приходом весны начать работы, связанные с покраской костёла внутри и снаружи, чтобы мог хорошо высохнуть [снаружи костёл уже покрашен, а внутри должен быть покрашен до зимы. – Семашко]. Поэтому я очень благодарен пану Збигневу за пожертвование, которое передал и за то, которое собирается дать. Я хотел, чтобы этот костёл выглядел красиво, но после Нового года цены в Беларуси почти в 5 раз поднялись, а пожертвования людей увеличились совсем немного. Поэтому буду радоваться каждому пожертвованию, которое получу". (Пераклад з польскай мовы).

На адным з могільнікаў (як называюць мясцовыя жыхары – „на гліне") захавалася грабніца былых уладальнікаў Рудкі – Длужнеўскіх **(гл. фота 29)**, цяпер апраўлена. Пабудавана Леапольдам Длужнеўскім на мяжы XIX-XX стст. Апошнім з іх быў Ян – улан з 1919 года атрада Дамброўскага. Аб ім З. Сямашка ў лісце ад 02.04.97 г. да мяне падае так: „Старэйшы падафіцэр Длужнеўскі з Рудкі быў арыштаваны ў Вільні ў чэрвені 1941 г., потым служыў


у арміі на Блізкім Усходзе, а яго жонка была ў Афрыцы. Пасля вайны жылі ў Лондане. Меў я з імі вельмі добрыя адносіны, быў выканаўцам яго запавету і пахаваў тут у 70-х гг. Супруга памерла раней. (Калі я наведываў яго ўжо цяжка хворага, казаў, што хоча памерці, таму што яму ўжо ўсё баліць, а найболей паясніца: „Занця (жонка) заўсёды казала мне, што калі буду няверны ёй, то будзе балець паясніца. І баліць. І адкуль яна ведала?")".

Заслугоўвае ўвагі мінулае вёскі-суседкі Дунілавіч – Старыя Ясеневічы. Двор у Ясеневічах быў самым старым радавым маёнткам сям'і Пятровін-Янішэўскіх герба Юноша на Віленшчыне.

Да гэтага ўладання пазней былі далучаны суседнія Данілавічы па распараджэнню караля Жыгімонта Аўгуста, а ў пачатку XIX ст. – паблізу размешчаны Красняны. У сярэдзіне XIX ст. уласнікам Ясеневічаў быў Цярэнціуш Янішэўскі. Краснян жа –



Фота 29. Усыпальня Длужнеўскіх (здымак 1997 г., цяпер апраўлена)



Фота 30. Сядзіба ў Ясеневічах

яго брат Актавіян. У 2-ой палове XIX ст. Данілавічы – уладанне 3-га брата былі прададзены Тышкевічам. Пасля смерці бяздзетнага Цярэнціуша, Ясеневічы ў спадчыну перайшлі яго пляменніку Віктару, сыну Актавіяна. Такім чынам, абодвы маёнткі ізноў сталіся ў адных руках. Віктар Янішэўскі прадаў вельмі пашкоджаныя першай сусветнай вайной Ясеневічы рээмігранту Нялі-повічу, пакінуўшы сабе Красняны.

На рубяжы XVIII-XIX стст. у Ясеневічах узнік вельмі абшырны драўляны аднапавярховы двор, пабудаваны па плану доўгага прамавугольніка, накрыты высокім гладкім 4-х схільным гантовым дахам. Галоўны ўваход быў афармлены ганкам з двума парамі каменных калон, падтрымліваючых трохвугольны верх з паўкруглым акном. Не вельмі вялікія вокны, складзеныя з 6 квадратаў, мелі стаўні **(гл. фота 30)**.

Знутры дом меў сіметрычнае распалажэнне, двухтрактовы з анфіладнай устаноўкай дзвярэй. Будынак змяшчаў двое сяней: галоўныя і „садовыя". З правага боку ад іх знаходзіўся агром-

ністы прадаўгаваты салон, займаючы ўсю шырыню збудавання з 10 вокнамі. Другі – меншы, квадратны, знаходзіўся ў левай палове. Іншыя памяшканні служылі як сталоўкі, жылыя, гаспадарчыя і інш. Так як Ясеневічы на працягу апошніх гадоў XIX пач. XX ст. не былі галоўным маёнткам уласнікаў, не мелі шмат антыкварных і фамільных рэчаў. Цяпер у гэтым будынку размешчаны дом-інтэрнат.

Паблізу галоўнага ўвахода і левага крыла двара стаяла вельмі цікавае збудаванне, старэйшае за жылы дом. Гэта быў свіран, які меў тры ярусы: склеп, першы паверх і мезанін (другі невялікі паверх). Пабудаваны па форме квадрата, хоць яго дах – гонтавы і 4-х схільны, трымаўся на абягаючай кругам балюстрадзе. Будынак абкружала сцяна, выкладзеная з вялікіх палявых камянёў.

З боку Данілавіч у двор вяла старая каштанавая алея. У яе пачатку знаходзілася невялікая, магчыма XVII ст., драўляная капліца. Перад домам цягнуўся дастаткова вялізны газон. Вакол свірана, а таксама паблізу правага крыла, расло некалькі старых дрэў, пераважна хвойных. З тылу дома знаходзіўся фруктовы сад, закрыты з трох бакоў ліпавымі прысадамі. Яшчэ адзін прасцяг ліп ахоплівaў прысядзібны гарод разам з гаспадарчымі пабудовамі.

Апісанне двара зроблена са слоў дачкі перадапошняга ўладальніка Ясеневіч, Эстэлі з Янішэўскіх Валянскай.

Апошнімі ўласнікамі былі Юзаф і Францішак Наліновічы – „амерыканцы": набылі Ясеневічы пасля вяртання з ЗША ў пачатку XX ст. Францішак аўдавеў, маючы 2-х дзяцей. Юзаф меў выгляд сапраўднага амерыканца: насіў тоўсты пазлачаны ланцужок на жываце, апранаў камізэльку, ездзіў заўсёды на пары коней і пазіраваў пад заможнага пана.

Сакавік 1998 г., Варапаева.

КРЫНІЦЫ І ЛІТАРАТУРА

1. Аддзел фондаў грамадскіх арганізацый дзяржархіва Віцебскай вобласці:

ф. 7043, воп. 1, спр. 4, арк. 2, 3, 20, 21, 46, 49-50;
ф. 7043, воп. 1, спр.16, арк. 69, 78;
ф. 7043, воп. 1, спр. 40, арк. 1-2, 10;
ф. 7043, воп. 1, спр. 156, арк. 2;
ф. 7043, воп. 1, спр. 217, арк. 6, 10, 11, 15, 31, 27, 34, 42-43, 53-54, 74, 93, 97, 114;
ф. 7043, воп. 7, спр. 40;
ф. 7049, воп. 1, спр. 6, арк. 50;
ф. 7049, воп. 1, спр. 7, арк. 3, 9;
ф. 7049, воп. 1, спр. 9, арк. 29;
ф. 7049, воп. 1, спр. 35, арк. 54, 78;
ф. 7049, воп. 1, спр. 37, арк. 3-4, 32-33;
ф. 7049, воп. 1, спр. 42, арк. 60.

2. Архіў Траецкага касцёла ў Дунілавічах.

3. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці ў г. Маладзечна:
ф. 2, воп. 1, спр. 206, арк. 4-5;
ф. 386, воп. 1, спр. 12, арк. 3.

4. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у г. Санкт-Пецярбургу:
ф. 577, воп. 3, спр. 3, арк. 2;
ф. 577, воп. 3, спр. 119, арк. 4;
ф. 577, воп. 3, спр. 340, арк. 7.

5. Філіял дзяржархіва Віцебскай вобласці ў г. Глыбокае:
ф. 1537, воп. 1, спр. 1, арк. 10-14, 15-23;
ф. 1537, воп. 1, спр. 12, арк. 2;
ф. 1537, воп. 2, спр. 105.

* * * * * * *

6. *Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць*. Мінск 1988.

7. Зямчонак І., *Мястэчка пры гасцінцы. Старонкі гісторыі Варапаева і бліжэйшых населеных пунктаў*. Мінск, Беларусь-Інфарм-Сэрвіс, 1995.

8. Зямчонак І., *Падарожжа ў гісторыю* // Пастаўскі край, 1993, № 90 (7209).

9. Зямчонак І., *Іх змалаціліцапамі рэпрэсій* // Народнае слова, 1994, № 92 (451).

10. Зямчонак І., *Сталінскі „сенакос" на Пастаўшчыне* // Сумежжа, 1995, № 7 (72), 8 (73).

11. Зямчонак І., *Лічыўся райцэнтрам, а горадам не стаў* // Сумежжа, 1994, № 7 (50) – 10 (53).

12. Зямчонак І., *Кулацкія справы. Як ішла прымусовая калектывізацыя ў Дунілавіцкім раёне* // Сумежжа, 1994, №№ 10 (53) – 14 (57).

13. Зямчонак І., *Данілавічы 1473-1998. Гістарычны нарыс* // Краязнаўца Паазер'я, 2000, № 1.

14. *Помнікі Віцебскай вобласці*, Мінск 1981.

* * * * * * *

15. Aftanazy R., *Dzieje rezydencji w dawnych kresach Rzeczypospolitej. Województwo Wileńskie*, Wrocław-Warszawa-Krakow 1993.

16. *Encyklopedia powszechna*, t. 3, Warszawa 1988.

17. Niesiecki K., *Herbarz Polski*, t. IX, Lipsk 1842.

18. Orgelbrand S., *Encyklopedja Powszechna*, t. XIV, Warszawa 1903.

19. *Polska encyklopedia szlachecka*, t. 1, Warszawa 1935.

20. Przysposobienie Rolnicze, 1934.

21. Rąkowski G., *Wśród jezior i mszarów Wileńszczyzny*, Warszawa 2000.

22. Siemaszko Z. S., *Niektóre parafie w dawnym Wielkim Księstwie Litewskim* // Duszpasterz polski za granicą, Rzym 1990.

23. *Słownik Geograficzny Królewstwa Polskiego i innych krajów Słowiańskich*, t. XIII, Warszawa 1893.

24. *Spis Miejscowości do Treści Adresowej*, 1927.

* * * * * * *

25. Алексеев А. В., *По Западной Двине и Днепру в Белоруссии*, Москва 1974.

26. Гошкевич И., *Виленская губерния. Полный список населенных мест со статистическими данными*, Вильно 1905.

27. Евсеев М., *Свентянский прорыв.*

28. *Памятная книжка Виленской губернии 1898 г.*, Вильно 1898.

29. Певнев А., *Конница в Свентянском прорыве (из опыта империалистической войны)* // Война и революция.

30. Сапунов А., Друцкий-Любецкий В., *Материалы по истории и географии Дисненского и Вилейского уездов Виленской губернии*, Витебск 1896.


31. Цыбульский Л., *Опыт исследования одной волости по образцу которой предполагается описать Виленскую губернию*, Вильно 1902.

32. Усов М., *В семье партизанской*, Минск 1998.


33. Шкуцько Л., Канапацкі І., *Калектывізацыя сельскай гаспадаркі рэспублікі. Вопыт гісторыі* // Усебеларуская канферэнцыя гісторыкаў. Менск, 3-5 лютага 1993 г.

Фрагмент карты 1865 г. З фондаў Расійскага
Дзяржаўнага Гістарычнага Архіва ў С.-Пецярбургу.

Карта 1.


Dunilowicze
WOROPAJEWO
Łuczaj
0 2 4 km
Łukaszewo
Cieszyłów
Junki
Przewoz
Czeronki
POSTAWY
Mańkowicze
Miadziołka
jez. Dołża

Карта 2.


Worobjajewo
Jasiuki
Ozarna
Przeczkow
Myszki
Ankudy Dunilowickie
Jasiewicze
Ozuny
Swidno
Oaszki
Piesczany
Lisice
Dunilowicze
Glinszczyzna
Przesiega
Nowosiolki
Piotrowicze
Kukisze
D. Michalino
Siemiejewicze

Карта 3.

Выдавецкая ініцыятыва «Сумежжа»

Выйшлі з друку:

2000 год

Райнольд Тызенгаўз «Крэда служачага»
Ігар Пракаповіч «Адкуль паходзяць назвы»

2001 год

«Рунь» – паэтычны альманах
Алесь Касцень «Вясковыя і местачковыя гісторыі»
"Нашы карані" № 1, 2, 3
ілюстраваны часопіс краязнаўцаў Паазер'я

2002 год

Алесь Гарбуль «Скарбы сівых валуноў»
"Нашы карані" № 4

2003 год

Іосіф Атрахімовіч «Перад мальбертам»
Міхась Райчонак «Нашчадкам»
Марыя Храмая «Мае летуценні»
Валянціна Гучык «Прызнанне»
Каталог матэрыялаў аб жыцці і дзейнасці Станіслава Нарбута
"Нашы карані" № 5, 6, 7, 8, 9, 10
"Браслаўскія сшыткі"

2004 год

Ігар Пракаповіч «Насельніцтва Пастаўскага краю»
Ігар Пракаповіч, Анастасся Вансовіч, Ірына Заяц «Манькавічы»
Іосіф Шудзель «Холад Сібіры»
Яська Драўніцкі «Мая Віленшчына»



Выдавецкая ініцыятыва

«СУМЕЖЖА»

Віцебская вобл., г.Паставы

факс (тэл.): (02155) 2-17-84

e-mail: michal.hil@tut.by

www.sumiezza.org